**УДК 392:273.2(476.5)** **DOI 10.52928/2070-1608-2023-67-2-86-93**

# СТАРАВЕРСКІЯ АБШЧЫНЫ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў СЯРЭДЗІНЕ 1940-х – 1950-я гг.

***канд. гіст. навук, дац. У.Я. АЎСЕЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0002-6433-0039***

*Артыкул прысвечаны характарыстыцы стараверскіх абшчын у Паўночна-заходняй Беларусі ў сярэдзіне 1940-х – 1950-х гг. Аналізуецца стан стараверства ў рэгіёне ў гэты перыяд, прасочваюцца працэсы афіцыйнага афармлення (рэгістрацыі) стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў, характарызуюцца іх узаемаадносіны з органамі савецкай ўлады. На аснове архіўных матэрыялаў у працы асвятляецца дзяржаўная палітыка ў адносінах стараверскай царквы ў Паўночна-заходняй Беларусі ў адзначаны храналагічны прамежак.*

***Ключавыя словы:*** *стараверы, этнічная група, рэлігійная абшчына, канфесія, Паўночна-заходняя Беларусь, дзяржаўна-канфесійныя адносіны.*

**Уводзіны.** Паўночна-заходні рэгіён Беларусі з'яўляецца адным з трох гістарычных цэнтраў кампактнага пражывання рускіх стараавераў у межах краіны [1]. За працяглы перыяд на гэтых землях сфарміравалася даволі вялікая зона стараверскіх пасяленняў (асноўныя арэалы размяшчаюцца на тэрыторыі Браслаўскага, Міёрскага, Шаркаўшчынскага, Пастаўскага, Глыбоцкага раёнаў і пераходзяць на сучасныя літоўскія і латвійскія землі; невялікія арэалы фіксуюцца таксама ў Астравецкім, Ашмянскім, Мядзельскім і Валожынскім раёнах). У беларускай гістарыяграфіі тэма стараверства рэгіёна не адносіцца да ліку папулярных. Асабліва бракуе даследаванняў, прысвечаных гісторыі стараавераў паўночна-заходніх беларускіх земляў у другой палове XX ст. Менавіта ў гэты перыяд рэгіён становіцца важнейшым цэнтрам стараверства ў Беларусі.

Мэта дадзенай працы – даць характарыстыку стараверскім абшчынам рэгіёна ў пасляваенны перыяд (1945–1950-я гг.). Асновай для даследавання стаў комплекс архіўных матэрыялаў аб дзейнасці стараверскіх абшчын, якія адносяцца да справаводства Савета па справах рэлігійных культаў (ССРК). Гэты орган быў створаны ў СССР яшэ ў 1944 г. для кантроля дзейнасці рэлігійных арганізацый, акрамя Рускай Праваслаўнай царквы (для яе кантролю быў створаны асобны орган). Разам з цэнтральным ССРК, які дзейнічаў пры СНК СССР (з 1946 г. – пры Савеце Міністраў), пры рэспубліканскіх СНК (з 1946 г. – пры Саветах Міністраў) і абласных выканкамах быў сфарміраваны інстытут упаўнаважаных Савета. У працы выкарыстаны матэрыялы, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці. *Геаграфічныя межы* даследавання ахопліваюць тэрыторыю Паўночна-заходняй Беларусі. У адзначаны перыяд гэтая тэрыторыя адносілася да розных адміністрацыйных адзінак. З 1944 г. землі ўваходзілі ў склад Полацкай і Маладзечанскай абласцей. Яшчэ ў 1939 г. паўночна-заходнія раёны Беларусі былі аб'яднаны ў Вілейскую вобласць, якая ў 1944 г. была перайменавана ў Маладзечанскую. У тым жа годзе частка яе раёнаў была перададзена ў склад Полацкай вобласці (Малюнак 1). Але ў 1954 г. Полацкая вобласць была ліквідавана і яе дзевяць раёнаў ізноў былі перададзены ў склад Маладзечанскай, якая ў 1960 г. была скасавана і тэрыторыі адыйшлі ў склад Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай абласцей.




**Малюнак 1. – Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел у Паўночна-заходняй Беларусі (1945 г.)**

**Асноўная частка.** Стан стараверскіх абшчын у Паўночна-заходняй Беларусі ў пасляваенны перыяд значным чынам быў абумоўлены асаблівасцямі іх развіцця ў папярэднія часы, асабліва ў 1920 – 1930-я гг. У міжваенныя гады рэгіён знаходзіўся ў складзе Польшчы. Нягледзячы на дамінаванне тут каталіцкага касцёла, становішча іншых канфесій у гэты перыяд было дастаткова нядрэнным, таму стараверская царква развівалася ў адносна спрыяльных умовах. Гэта прывяло да росту колькасці абшчын і іх вернікаў. Ужо ў канцы 1930-х гг. на тэрыторыі Паўночна-заходняй Беларусі налічвалася 30 стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў (малюнак 2), у якіх налічвалася звыш 30 тыс. вернікаў [2, с. 47]. У наступныя перыяды гэта асаблівасць прадвызначыла дамінаванне рэгіёна сярод іншых стараверскіх цэнтраў на беларускіх землях. Астатнія рэгіёны кампактнага рассялення старавераў у Беларусі знаходзяцца ў Паўночна-ўсходняй і Паўднёва-ўсходняй яе частках. У міжваенны перыяд гэтыя тэрыторыі ўваходзілі ў БССР, дзе становішча стараверскай царквы было непараўнальна горшым чым на заходнебеларускіх землях, што вылілася ў масавае закрыццё храмаў і спыненне афіцыйнай дзейнасці абшчын. Усё гэта істотным чынам паўплывала на стан стараверскай супольнасці ў Беларусі ў наступныя перыяды.




**Малюнак 2. – Стараверскія абшчыны на заходнебеларускіх землях у другой палове 1930-х гг.**

Цэнтры абшчын (адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел прадстаўлены на сучасны стан):
*Ашмянскі раён:* 1. Гедэйкі, 2. Новая Слабада.
*Валожынскі раён:* 3. Масцішча.
*Астравецкі раён:* 4. Стрыпішкі.
*Мядзельскі раён:* 5. Свір.
*Пастаўскі раён:* 6. Апідамы, 7. Кукляны, 8. Захараўшчына, 9. Лучай.
*Браслаўскі раён*: 10. Відзы, 11. Астровішкі, 12. Грыгараўшчына, 13. Мінкавічы, 14. Мікалаюнцы, 15. Рымуці, 16. Булавішкі, 17. Лаўнікі, 18. Мацешы, 19. Буеўшчына, 20. Кірыліна, 21. Друя.
*Міёрскі раён:* 22. Ніўнікі, 23. Кублішчына.
*Шаркаўшчынскі раён:* 24. Барсучына, 25. Яжоўка, 26. Варонка, 27. Ракаўцы, 28. Германавічы.
*Глыбоцкі раён:* 29. Ластавічы, 30. Залессе.

Нягледзячы на цяжкія страты, якія панесла стараверская супольнасць Паўночна-заходняй Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай Вайны (разбурэнне храмаў, знішчэнне насельніцтва і г.д.), большасць яе рэлігійных аб'яднанняў працягвала сваю дзейнасць як падчас вайны, так і адразу пасля яе. Пры характарыстыцы іх стану ў першыя пасляваенныя гады неабходна адзначыць некаторую няпоўнасць афіцыйных даных. Як вынікае з аналізу архіўных матэрыялаў, больш пільная ўвага з боку Савета па справах рэлігійных культаў (далей – ССРК) і органаў улады за дзейнасцю стараверскіх рэлігійных абшчын у Паўночна-заходняй Беларусі была скіравана толькі з 1946 г. Па гэтай прычыне афіцыйная статыстыка 1944–1946 гг. няпоўная і мае недакладнасці. Так, згодна з данымі на канец 1945 г., на тэрыторыі БССР налічвалася 52 дзеючыя абшчыны старавераў. З іх у Маладзечанскай вобласці было зафіксавана толькі 3, а ў Полацкай – 4 [3, арк. 204, арк. 205]. Аднак ужо ў справаздачы ўпаўнаважанага ССРК па БССР за 1945 г. была прадстаўлена значна большая колькасць абшчын як у цэлым па Беларусі, так і па паўночна-заходнім рэгіёне. Згодна з гэтымі данымі ў межах Полацкай вобласці фіксавалася ўжо 12 рэлігійных аб'яднанняў старавераў, а ў Маладзечанскай – усё тыя ж 3 [3, арк. 289]. А яшчэ праз некаторы час іх колькасць як у Беларусі, так і ў паўночна-заходнім рэгіёне істотна "падрасла". Так, ужо напрыканцы 1946 г. па БССР налічвалася 71 стараверская абшчына. У сваю чаргу, у Полацкай вобласці іх было зафіксавана 20, а ў Маладзечанскай – 7 [4, арк. 71]. Але на самой справе гэты статыстычны "рост" быў абумоўлены толькі ўдакладненнем падлікаў. Як вынікае з аналізу крыніц, і гэтыя даныя па Полацкай і Маладзечанскай абласцях былі няпоўнымі (гл. ніжэй). Пачынаючы з 1949 г. у справаводчых матэрыялах ССРК фіксуецца некаторае памяншэнне колькасці стараверскіх прыходаў у рэгіёне. У гэтым годзе іх у Полацкай вобласці было зафіксавана толькі 16, а ў Маладзечанскай – 4 [5, арк. 196], але, як вынікае з аналізу матэрыялаў, гэтае памяншэнне носіць выключна фармальны характар, паколькі з гэтага часу ў афіцыйных справаздачах пачынае ўказвацца толькі колькасць абшчын, што атрымалі афіцыйную рэгістрацыю.

Пэўныя прабелы ва ўліку стараверскіх абшчын рэгіёна былі абумоўлены таксама складанасцю і працяглацю працэса іх афіцыйнага афармлення ў дзяржаўных органах. У межах Полацкай і Маладзечанскай абласцей значная колькасць абшчын была зарэгістравана толькі ў канцы 1940-х гг., а працэс афіцыйнага афармлення стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў у рэгіёне быў даволі цяжкім і прыпозненым у параўнанні з Усходняй Беларуссю. Так, ва Усходняй Віцебшчыне, большасць стараверскіх прыходаў атрымала афіцыйную рэгістрацыю яшчэ

на працягу 1945–1946 гг. [6, с.77–78], у той час як на захадзе рэгіёна асноўная іх колькасць – толькі ў 1947–1949 гг. На гэта паўплывала некалькі фактараў, але, найперш, нежаданне саміх абшчын афармляць афіцыйную рэгістрацыю ў савецкіх органах улады. На такую сітуацыю ў першыя пасляваенныя гады пастаянна звярталі ўвагу ў сваіх справаздачах ўпаўнаважаныя ССРК. Так, упаўнаважаны па Полацкай вобласці ў 1945 г. адзначаў наступнае: “Духовные наставники старообрядческих общин при разговоре о регистрации религиозного общества и о выборе ревизионной комиссии и исполнительного органа некоторые заявляли, что мы никакого заявления писать не будем о регистрации, выбирать в комиссии и исполнительные органы также не можем” [3, арк. 85]. У немалой ступені гэта было абумоўлена тым фактам, што ўсе стараверскія абшчыны рэгіёна з сярэдзіны 1920-х гг. былі падначалены Вышэйшаму стараверскаму савету (далей – ВСС) ў Вільні і там жа мелі адпаведную рэгістрацыю. А таму ў першыя пасляваенныя гады стараверскія святары (духоўныя настаўнікі) і вернікі не разумелі патрэбы ў атрыманні дадатковай рэгістрацыі абшчыны ў савецкіх органах улады. На такую асаблівасць даволі часта звярталі ўвагу ўпаўнаважаныя ССРК па Полацкай і Маладзечанскай абласцях [7, арк. 214, арк. 219; 8, арк. 106адв; 9, арк. 187]. Пры гэтым неабходна адзначыць, што і ў пасляваенны перыяд уплыў ВСС на рэлігійныя аб’яднанні старавераў Паўночна-заходняй Беларусі быў даволі істотным.

**Рэлігійныя абшчыны стараверау у межах Полацкай вобласці ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.** Большая частка стараверскіх прыходаў рэгіёна ў пасляваенны перыяд размяшчалася на тэрыторыі Полацкай вобласці. Яшчэ ў канцы 1930-х гг. на гэтых землях фіксавалася 22 рэлігійныя аб’яднанні (без уліку абшчыны ў г. Полацку, якая тэрытарыяльна адносіцца да Паўночна-ўсходняй зоны рассялення стараверау у Беларусі і ў дадзеным артыкуле разглядацца не будзе). Нягледзячы на цяжкія спусташэнні ў часы Вялікай Айчыннай Вайны, амаль усе яны працягнулі сваю дзейнасць пасля яе заканчэння. Як было адзначана вышэй, адразу пасля вайны не ўсе стараверскія абшчыны вобласці былі выяўлены і ўлічаны ССРК і мясцовымі органамі ўлады. І толькі з 1946 г. афіцыйныя статыстычныя даныя пачалі фіксаваць адносна аб’ектыўную карціну аб колькасці стараверскіх рэлігійных аб’яднанняў у Полацкай вобласці. Так, ужо ў пачатку 1946 г. у межах вобласці афіцыйная статыстыка паведамляла пра 20 стараверскіх абшчын, але толькі 4 з іх на той час прайшлі рэгістрацыю (табліца 1).

Табліца 1. – Стараверскія абшчыны Полацкай вобласці (па стану на пачатак 1946 г.)

| Раён / горад | Колькасць абшчын | | | Месца правядзення багаслужэнняў | |
|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | зарэгістраваных | незарэгістраваных | у храмах | у прыватных дамах |
| Г. Полацк | 1 | 1 | – | – | 1* |
| Браслаўскі раён | 7 | – | 7 | 3 | 4 |
| Відзаўскі раён | 3 | – | 3 | 3 | – |
| Шаркаўшчынскі раён | 4 | 1 | 3 | 3 | 1 |
| Міёрскі раён | 3 | 1 | 2 | 1 | 2 |
| Глыбоцкі раён | 2 | 1 | 1 | 2 | – |
| **Усяго** | **20** | **4** | **16** | **12** | **8** |

* – Мелася таксама напаўразбураная царква.

*Крыніца:* складзена аўтарам на аснове [8, арк. 106].

На працягу наступных двух гадоў большая частка стараверскіх рэлігійных аб’яднанняў Полацкай вобласці ўсё ж прайшла рэгістрацыю. На пачатку 1948 г. у яе межах па-ранейшаму фіксавалася 20 абшчын, 15 з якіх ужо былі зарэгістраванымі. Між тым 5 рэлігійных груп не прайшлі рэгістрацыю, у першую чаргу, з-за адсутнасці малітоўнага памяшкання. Па раёнах зарэгістраваныя абшчыны былі размеркаваны наступным чынам: Браслаўскі – 4, Відзаўскі – 3, Шаркаўшчынскі – 3, Міёрскі – 3, Глыбоцкі – 2. Яшчэ адна зарэгістраваная абшчына дзейнічала ў Полацку [10, арк. 152]. Згодна з данымі на 1949 г. у межах вобласці налічвалася ўжо 16 дзеючых стараверскіх рэлігійных аб’яднанняў. Як вынікае з аналізу архіўных матэрыялаў, 14 з гэтых абшчын мелі храмы, а 2 праводзілі багаслужэнні ў прыватных дамах. Па вобласці на гэты час налічвалася 14 святароў (духоўных настаўнікаў) [11, арк. 154, арк. 174, арк. 175].

У наступныя гады колькасць афіцыйна зарэгістраваных стараверскіх абшчын у Полацкай вобласці паменшылася. Так, згодна з крыніцамі, у канцы 1950 г. іх налічвалася 12, а ўжо на пачатку 1951 г. афіцыйна дзейнічала толькі 10 (у г. Полацку, в. Кублішчына, в. Ластавічы, в. Ракаўцы, мяст. Германавічы, в. Варонка, в. Булавішкі[1], в. Мікалаюнцы, в. Кірыліна, г. Відзы) [12, арк. 114]. За невялікімі зменамі, амаль такая ж колькасць афіцыйна зарэгістраваных стараверскіх прыходаў заставалася ў рэгіёне фактычна да канца 1980-х гг. Так, у хуткім часе была зарэгістравана Мінкавіцкая абшчына, а ў 1955 г. вернута рэгістрацыя Ніўнікаўскай (гл. ніжэй). За наступны перыяд толькі адна стараверская абшчына рэгіёна была пазбаўлена афіцыйнай рэгістрацыі (у 1969 г. – Мікалаюнцаўская) [13, арк. 68, арк. 73].

Найбольшая колькасць стараверскіх абшчын Полацкай вобласці ў пасляваенны перыяд дзейнічала на тэрыторыі сучаснага ***Браслаўскага раёна***. У 1945–1950-х гг. яго землі былі падзелены паміж Браслаўскім і Відзаўскім

[1] У дакуменце ўказана Буеўская абшчына. Аднак гэта ўказана памылкова, бо павінна быць Булавішская, якая дзейнічала ў той час афіцыйна і была зарэгістравана. У той час абшчына ў Буеўшчыне не зарэгістравана і дзейнічала нелегальна. Трэба адзначыць, што гэтыя абшчыны ня рэдка блытаюцца ў дакументах таго часу.

раёнамі (у 1960 г. Відзаўскі раён быў ліквідаваны і яго тэрыторыя ўвайшла ў склад Браслаўскага), а таксама зусім невялікая частка разам з пас. Друя знаходзілася ў складзе Міёрскага раёна. Яшчэ ў даваенны перыяд на тэрыторыі сучаснага Браслаўскага раёна аформілася 12 рэлігійных аб'яднанняў старавераў. Аднак па-рознаму склаўся іх лёс пасля Вялікай Айчыннай Вайны. На працягу 1947–1948 гг. былі зарэгістраваны тры стараверскія абшчыны ў в. Кірыліна, г. Відзы і в. Булавішкі. Адной з першых атрымала афіцыйную рэгістрацыю абшчына ў в. Кірыліна (14 жніўня 1947 г.) [14, арк. 20]. Відзаўская стараверская абшчына была зарэгістравана 3 сакавіка 1948 г. [15, арк. 34]. Па тыпавой дамове ад 20.03.1951 г. прыхажанам у карыстанне быў перададзены храм у г. Відзы [15, арк. 32], а стараверская абшчына ў в. Булавішкі атрымала афіцыйную рэгістрацыю 22 чэрвеня 1948 г. [16, арк. 21, арк. 22].

Нягледзячы на тое, што па БССР у канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг. назіраецца ліквідацыя многіх стараверскіх абшчын, у паўночна-заходнім рэгіёне, наадварот, фіксуюцца прыклады рэгістрацыі новых. Гэта адбывалася нават нягледзячы на тое, што упаўнаважаны ССРК па БССР ад 09.06.1949 г. выдаў указанне, якое забараняла рэгістраваць новыя рэлігійныя аб'яднанні [17, арк. 10]. На працягу 1951–1952 гг. прайшлі рэгістрацыю стараверскія абшчыны ў Мінкавічах і Мікалаюнцах. Так, 4 сакавіка 1951 г. была накіравана заява на імя ўпаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў па Полацкай вобласці ад вернікаў Мікалаюнцаўскай абшчыны з просьбай аб рэгістрацыі [15, арк. 1]. Абшчына была зарэгістравана 7 жніўня 1951 г.[2] [13, арк. 69], а тыпавая дамова на перадачу храма ў карыстанне вернікам была падпісана яшчэ 24 верасня 1950 г. [13, арк. 4].

Як сведчаць крыніцы, у 1950 г. упаўнаважаным ССРК па Полацкай вобласці была выяўлена "нелегальна дзеючая" стараверская абшчына ў в. Мінкавічы. Нягледзячы на тое, што вернікі ў 1951 г. падалі дакументы на рэгістрацыю [18, арк. 3], афіцыйнага заканадаўчага афармлення абшчына спачатку не атрымала. Гэта адбылося таму, што ўпаўнаважаны па вобласці дзейнічаў у адпаведнасці з указаннем упаўнаважанага па БССР ад 09.06.1949 г. Аднак, з-за таго што паблізу ад Мінкавіцкага прыходу не было дзеючай зарэгістраванай абшчыны, да якой можна было б далучыць яго, упаўнаважаны па Полацкай вобласці хадайнічаў аб яго рэгістрацыі. Яго аргументацыя падмацоўвалася наступным чынам: "чтобы не ущемлять религиозные чуства верующих, считаю целесообразным, как исключение, зарегистрировать Минковичскую старообрядческую общину" [17, арк. 10]. Яшчэ ў ліпені 1951 г. была падпісана дамова на перадачу храма вернікам, а ў сакавіку 1952 г. абшчына атрымала афіцыйнае афармленне [18, арк. 11, арк. 18].

Яшчэ дзве стараверскія абшчыны рэгіёна ў пасляваенны перыяд атрымалі афіцыйнае афармленне –Астровішская і Друеўская (апошняя ў той час знаходзілася на тэрыторыі Міёрскага раёна). Аднак у хуткім часе яны былі знятыя з афіцыйнага ўліку. У дакументах ССРК даныя аб часе, прычынах і асаблівасцях закрыцця гэтых абшчын некалькі разыходзяцца. Так, афіцыйныя крыніцы паведамляюць, што стараверская абшчына ў Друі прыпыніла сваю дзейнасць у сярэдзіне 1950 г. з-за адсутнасці малітоўнага дома, а яе духоўны настаўнік А.А. Аляксееў пераехаў у Літву. Аднак яшчэ на пачатку 1951 г. упаўнаважаны ССРК выклікаў духоўнага настаўніка для папярэджання аб магчымым роспуску абшчыны [12, арк. 115; 17, арк. 39; 19, арк. 65]. У сваю чаргу, Астровішская абшчына мела свой храм [17, арк. 39], аднак усё роўна была пазбаўлена магчымасці працягнуць легальную дзейнасць. У справаздачы ўпаўнаважанага ССРК па БССР за 2 квартал 1951 г. адзначалася, што Астровішскую абшчыну варта зняць з рэгістрацыі, паколькі яна прыпыніла сваю дзейнасць яшчэ ў 1949 г. па прычыне адмовы выконваць святаром свае функцыі [19, арк. 65]. У іншай крыніцы адзначалася, што абшчына не дзейнічае з 01.02.1950 г. і з гэтага часу яе вернікі ўжо далучыліся да суседняй Відзаўскай абшчыны [17, арк. 39]. У выніку было прынята рашэнне Полацкага абласвета аб закрыцці гэтых абшчын (Друеўскай і Астровішскай) і зняцця з рэгістрацыі [17, арк. 40].

Разам з тым, на Браслаўшчыне (у адпаведнасці з тагачаснымі адміністрацыйнымі адзінкамі – на тэрыторыі Відзаўскага і Браслаўскага раёнаў) функцыянавалі і незарэгістраваныя групы вернікаў-старавераў. Старшы інспектар упаўнаважанага Савета па БССР па пытаннях вывучэння дзейнасці рэлігійных абшчын у Полацкай вобласці на пачатку 1950 г. выявіў яшчэ 4 незарэгістраваныя стараверскія групы ў вв. Лаўнікі, Рымуці, Буеўшчына, Мацешы. Ва ўсіх гэтых абшчынах адсутнічалі храмы і багаслужэнні яны праводзілі па хатах [20, арк. 12]. Як вынікае з аналізу архіўных даных, стараверская абшчына ў в. Лаўнікі яшчэ ў 1946 г. набыла хату і прыстасавала яе пад малітоўны дом, але, паколькі абшчына не была зарэгістравана, то мясцовы сельсавет забараніў там праводзіць багаслужэнні, а малітоўны дом прапанаваў перадаць пад школу. Як вынікае з архіўных матэрыялаў, якія храналагічна адносяцца да пачатку 1949 г., гэта рэлігійная група ўжо не дзейнічала, а яе вернікі далучыліся да суседняй Булавішскай абшчыны [11, арк. 106; 5, арк. 13]. Стараверскі храм у в. Рымуці быў знішчаны яшчэ ў 1941 г. акупантамі [13, арк. 15–16адв]. Нягледзячы на яго адсутнасць, абшчына яшчэ некаторы час дзейнічала пасля вайны. Аднак у 1951 г. яе духоўны настаўнік А.Р. Зуеў перайшоў служыць у Мікалаюнцаўскую абшчыну [13, арк. 17]. Стараверскі храм у в. Мацешы таксама згарэў у час вайны ў 1944 г., але абшчына працягвала дзейнічаць у пасляваенны перыяд, а багаслужэнні адбываліся па хатах вернікаў [20, арк. 10].

Яшчэ адна група вернікаў-старавераў дзейнічала ў в. Буеўшчына. Як вынікае з аналізу архіўных крыніц, яе храм згарэў яшчэ ў 1936 г. У 1939 г. пачалося будаўніцтва новага, але з-за Вялікай Айчыннай Вайны завяршыць яго не ўдалося. Пасля заканчэння вайны недабудаваны храм перайшоў ва ўласнасць мясцовага калгаса, які закончыў пабудову і стаў яе выкарыстоўваць пад зернесховішча. Нягледзячы на гэта, абшчыне працягвала дзейнасць, праводзячы багаслужэнні ў доме святара [21, арк. 211]. У пасляваенны перыяд на Браслаўшчыне існавала яшчэ адна стараверская абшчына ў в. Грыгараўшчына. Аднак у афіцыйных справаводчых дакументах ССРК

[2] Аднак у іншым дакуменце сустракаецца дата афіцыйнай рэгістрацыі роўна на год пазней – 07.08.1952 г. [13, арк. 30].

і мясцовых органаў улады 1945 – пачатку 1950-х гг. інфармацыя аб ёй не выяўлена. У больш позніх дакументах (сярэдзіна 1950-х гг.) усё ж сустракаюцца даныя аб яе нелегальнай дзейнасці (гл. ніжэй).

Такім чынам, у пасляваенныя гады на тэрыторыі сучаснага Браслаўскага раёна 5 стараверскіх абшчын працягнулі афіцыйную дзейнасць (Відзаўская, Кірылінская, Булавішская, Мікалаюнцаўская і Мінкавіцкая), 7 абшчын функцыянавалі без рэгістрацыі і іх дзейнасць афіцыйна спынілася (Рымуцкая, Буеўшчынская, Мацешская, Астровішская, Грыгараўшчынская, Друйская, Лаўнікаўская). На працягу даследуемага перыяду некаторыя з іх далучыліся да дзеючых, а шэраг працягвалі сваю працу нелегальна.

У першыя пасляваенныя гады на тэрыторыі сучаснага ***Шаркаўшчынскага раёна*** працягвалі дзейнасць 4 стараверскія абшчыны (у вв. Барсучына, Варонка, Германавічы, Ракаўцы), якія атрымалі і афіцыйную рэгістрацыю. Сярод іх першай была зарэгістравана абшчына ў в. Варонка (12 студзеня 1946 г.) [22, арк. 20], але толькі ў студзені 1948 г. была заключана тыпавая дамова на перадачу Варонкаўскага храма вернікам [22, арк. 12]. 18 верасня 1947 г. была зарэгістравана абшчына ў в. Ракаўцы (цяпер у складзе г.п. Шаркаўшчына) [23, арк. 16]. Стараверская абшчына ў в. Германавічы была зарэгістравана 23 снежня 1947 г. [24, арк. 21]. Абшчына ў в. Барсучына таксама прайшла рэгістрацыю, аднак праз некаторы час была яе пазбаўлена. Як сведчаць архіўныя крыніцы за 1949 г., зняцце з рэгістрацыі было ініцыявана самім духоўным настаўнікам Ф.С. Войтавым, які не хацеў плаціць падаткі як святар. Аднак пасля зняцця з рэгістрацыі яму забаранілі праводзіць багаслужэнні і выконваць рэлігійныя абрады. У наступным Ф.С. Войтаў спрабаваў ізноў прайсці рэгістрацыю абшчыны, аднак яго намаганні поспехаў не мелі [11, арк. 157]. Як вынікае з архіўных крыніц, з 1950 г. рэлігійнае аб'яднанне ўжо не дзейнічала, а сам Ф.С. Войтаў выехаў у Літву [17, арк. 39].

У межах сучаснага ***Міёрскага раёна*** ў пасляваенны перыяд дзейнічала 2 рэлігійных аб'яданні старавераў-беспапоўцаў у в. Кублішчына і в. Ніўнікі (як ужо было адзначана вышэй, у той час на тэрыторыі раёна яшчэ адна абшчына была ў Друі). Усе яны прайшлі афіцыйную рэгістрацыю, аднак у 1952 г. Ніўнікаўская абшчына была з яе знята. Рашэннем ад 21 мая 1952 г. Савет па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў СССР санкцыянаваў закрыццё храма. Гэта адбылося на падставе рашэння выканкама Полацкага абласнога савета ад 20 снежня 1951 г. Закрыццё адбылося на аснове інфармацыі, якую прадставіў упаўнаважаны ССРК па Полацкай вобласці. Даючы заключэнне, ён адзначыў, што Ніўнікаўская абшчына малаколькасная, налічвала каля 60 чалавек і малітоўны дом не выкарыстоўвае. У сваю чаргу, як аказалася, гэтыя даныя абсалютна не адпавядалі рэальнай карціне, на што потым звярталі ўвагу ў ССРК і рэгістрацыю абшчыны праз пэны час аднавілі [25, арк. 5].

На тэрыторыі ***Глыбоцкага раёна*** ў пасляваенны перыяд фіксаваліся дзве стараверскія абшчыны з цэнтрамі ў в. Ластавічы і в. Залессе, аднак толькі Ластавіцкая абшчына была зарэгістравана і працягнула легальную дзейнасць. У той жа час Залеская абшчына ў пасляваенны перыяд хоць і згадваецца як афіцыйна дзеючая, але як вынікае з архіўных дакументаў, афіцыйнай рэгістрацыі так і не атрымала. Пры гэтым варта адзначыць, што яшчэ ў 1945 г. Залеская стараверская царква была ўзята на дзяржаўны ўлік [26, с. 143], а з 1944 г. абшчына выплочвала ўсе неабходныя падаткі і плацяжы [27, арк. 40]. Пры гэтым архіўныя дакументы сведчаць, што на працягу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя вернікі прадпрымалі спробу зарэгістраваць абшчыну. Так, упаўнаважаны ССРК па Полацкай вобласці адзначаў, што на пачатку 1951 г. у рэгістрацыйнай справе абшчыны была частка дакументаў. Згодна з яго інфармацыяй, на 21 лютага 1951 г. быў выкліканы духоўны настаўнік, які аднак не з'явіўся і дакументы не прадставіў. Згодна з даведкай Глыбоцкага выканкама ў гэты час абшчына ўжо не дзейнічала [12, арк. 114, арк. 115]. Аднак на самой справе абшчына функцыянавала і вернікі працягвалі ажыццяўляць спробы зарэгістраваць абшчыну. Так, 30 верасня 1953 г. паступіла новая пісьмовая заява ад вернікаў-стараівераў в. Залессе аб рэгістрацыі іх рэлігійнага аб'яднання [28, арк. 286], аднак усе гэтыя намаганні не прынеслі плёну і ў 1961 г. стараверскую царкву перадалі пад патрэбы Залескай школы.

У пасляваенны перыяд на тэрыторыі ***Дунілавіцкага раёна*** Полацкай вобласці працягвала функцыянаваць стараверская абшчына ў в. Лучай, доўгі час застаючыся няўлічанай. Лучайская стараверская абшчына ў пасляваенны перыяд не была зарэгістравана. Згодна з архіўнымі данымі, яна дзейнічала ў пасляваенныя гады да 1948 г., аднак з-за малой колькасці вернікаў і неактыўнага наведвання храма святар пакінуў абшчыну і перайшоў у іншую [29, арк. 34]. Храм у гэтым жа годзе быў зачынены Дунілавіцкім райвыканкамам, вернікі сталі збірацца для багаслужэнняў па хатах. Факт такіх маленняў быў выяўлены ўпаўнаважаным ССРК па Полацкай вобласці ў 1951 г. [12, арк. 166]. Вернікі ўсё ж спрабавалі легалізаваць сваю абшчыну і ў 1953 г. накіравалі заяву на рэгістрацыю [28, арк. 284]. Аднак рашэннем 16 мая 1953 г. Полацкі аблвыканкам заяву не падтрымаў. У якасці прычыны адхілення ўказваўся той факт, што "до 1951 г. проводили молитвенные собрания в частных домах" [28, арк. 104]. Нягледзячы на гэта, абшчына працягвала дзейнічаць нелегальна (гл. ніжэй).

**Стараверскія абшчыны на тэрыторыі Маладзечанскай вобласці (1945–1954 гг.).** Як вынікае з аналізу крыніц, у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе на тэрыторыі Маладзечанскай вобласці дзейнічала 8 стараверскіх абшчын. Аднак некаторы час у справаздачах упаўнаважанага ССРК па вобласці і ў дакументах мясцовых органаў улады не ўсе гэтыя абшчыны былі ўлічаны. Толькі ў матэрыялах канца 1946 г. утрымліваюцца звесткі аб 8 абшчынах на тэрыторыі вобласці. Па раёнах іх колькасць была размеркавана наступным чынам: у Свірскім – 2 абшчыны, у Юрацішскім – 1, Пастаўскім – 3, Іўеўскім – 1, Ашмянскім – 1. Аднак ніводная з абшчын вобласці яшчэ не была зарэгістравана [7, арк. 76–77]. Такая ж колькасць стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў у межах вобласці фіксавалася і ў пачатку 1947 г. [7, арк. 214]. Аднак ужо ў даных за 1949 г. у Маладзечанскай вобласці было зафіксавана толькі 7 стараверскіх абшчын, у тым ліку ў межах Пастаўскага раёна толькі 2 (у в. Апідамы і в. Кукляны) [30, арк. 124].

Даныя пра трэці стараверскі прыход Пастаўскага раёна, які размяшчаўся ў в. Захараўшчына, ужо ў гэты перыяд "знікаюць" з афіцыйнай справаводчай дакументацыі і афіцыйных справаздач упаўнаважанага ССРК па Маладзечанскай вобласці. Аднак яшчэ ў дакументах канца 1948 г. інфармацыя пра яе сустракалася [11, арк. 32].

Пачынаючы з 1947 г. стараверскія рэлігійныя аб'яднанні вобласці прадпрымаюць намаганні па афіцыйным афармленні ў дзяржаўных органах. Да 1949 г. былі зарэгістраваныя 5 абшчын (у в. Масцішча Юрацішскага раёна, в. Апідамы і в. Кукляны Пастаўскага раёна, пас. Свір і в. Стрыпішкі Свірскага раёна). Абшчыны ў в. Гедэйкі Ашмянскага раёна, в. Новая Слабада Смаргонскага раёна і в. Захараўшчына Пастаўскага раёна зарэгістраванымі не былі. Як вынікае з аналізу архіўных матэрыялаў, прычыны, якія перашкодзілі рэгістрацыі, былі розныя. Так, стараверы Гедэйкаўскай абшчыны ў 1948 г. накіроўвалі заяву на рэгістрацыю, аднак яна, як вынікае з афіцыйных дакументаў, не была падтрымана з-за адсутнасці храма [11, арк. 32]. На самой жа справе ў в. Гедэйкі стараверскі храм пачалі будаваць яшчэ ў час Вялікай Айчыннай Вайны, аднак у 1945 г. працягнуць будаўніцтва не ўдалося з-за забароны мясцовага сельсавета [30, арк. 125]. У сваю чаргу, у Нова-Слабадской абшчыне храм быў. У некаторых архіўных дакументах ён згадваецца як дзеючы ў 1949 г. [11, арк. 256адв]. Згодна з аднымі данымі, абшчына не была зарэгістравана, паколькі не мела святара і вернікі за рэгістрацыяй не звярталіся [30, арк. 125]. Аднак іншыя крыніцы паведамляюць, што святар усё ж такі меўся, але яму быў устаноўлены падатак, які той адмовіўся выплочваць і з'ехаў у Літву [5, арк. 35].

Лідарам па колькасці стараверскіх абшчын у рэгіёне быў ***Пастаўскі раён***. У пасляваенны перыяд ў яго межах дзейнічалі 3 абшчыны з цэнтрамі ў вв. Апідамы, Кукляны, Захараўшчына. Два з гэтых прыходаў (Апідамскі і Куклянскі) атрымалі афіцыйную рэгістрацыю [31, арк. 3, арк. 5]. Ужо ў канцы 1948 г. на тэрыторыі Пастаўскага раёна афіцыйна дзейнічала толькі адна Куклянская абшчына. Апідамская была знятая з рэгістрацыі па той прычыне, што яе вернікі адмаўляліся прымаць да сябе і рэгістраваць новага духоўнага настаўніка пасля таго, як ранейшы быў арыштаваны [31, арк. 11–13, арк. 17]. Згодна з афіцынымі дакументамі, духоўны настаўнік Д.І. Панцыраў быў арыштаваны "за агитацию против коллективизации и защиту кулачества" [11, арк. 93]. У 1950 г. ад Апідамскай абшчыны паступіла заява з просьбай зарэгістраваць настаўнікам Дзямідава І.А., але з-за таго, што абшчына была знята з рэгістрацыі, новага духоўнага настаўніка не зацвердзілі. У гэты перыяд нават выказвалася прапанова з боку упаўнаважанага ССРК па БССР аб далучэнні Апідамскай абшчыны да Куклянскай [31, арк. 17].

**Стараверскія рэлігійныя аб'яднанні Маладзечанскай вобласці ў 1954–1960 гг.** У 1954 г. у Беларусі адбыліся адміністрацыйныя змены, у выніку якіх Полацкая вобласць была ліквідавана. Яе ўсходнія раёны былі перададзены ў Віцебскую вобласць, а заходнія – у Маладзечанскую. Такім чынам, амаль усе стараверскія рэлігійныя аб'яднанні былой Полацкай вобласці (за выключэннем Полацкай абшчыны) апынуліся ў Маладзечанскай. Так, згодна з афіцыйнымі данымі, на 30.09.1954 г. на яе тэрыторыі дзейнічала 14 зарэгістраваных рэлігійных аб'яднанняў старавераў [27, арк. 94]. Гэту колькасць склалі 4 ранейшыя абшчыны Маладзечанскай вобласці (Куклянская, Масцішская, Свірская, Стрыпішская) і 10 з былой Полацкай (Кублішчынская, Ластавіцкая, Ракаўская, Германавіцкая, Варонкаўская, Булавішкаўская, Мінкавіцкая, Мікалаюнцаўская, Кірылінская і Відзаўская). Пасля таго, як Апідамская і Ніўнікаўская абшчыны аднавілі рэгістрацыю, у межах вобласці фіксавалася ўжо 16 зарэгістраваных стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў. Такая колькасць захоўвалася да канца існавання Маладзечанскай вобласці.

У 1955 г. была адноўлена рэгістрацыя Ніўнікаўскай абшчыны. У гэтым годзе упаўнаважаны ССРК па Маладзечанскай вобласці, звярнуў увагу на тое, што яго былы калега – упаўнаважаны ССРК па Полацкай вобласці – "па невядомых прычынах" яўна няправільна ахарактарызаваў сітуацыю ў Ніўнікаўскай абшчыне і значна занізіў колькасць яе вернікаў. Як высветлілася, у гэты перыяд Ніўнікаўская рэлігійная абшчына аб'ядноўвала каля 2 тыс. чалавек. Разам з тым, члены абшчыны выказвалі сур'ёзнае незадаволенне закрыццём храма, а таксама звярталіся з просьбамі аднавіць рэгістрацыю [25, арк. 1, арк. 5]. Таму 25 жніўня 1955 г. ССРК пры Савеце Міністраў СССР пастанавіў дазволіць зарэгістраваць "фактически действующее общество" [25, арк. 8]. У гэтым жа 1955 г. абшчына была зарэгістравана, заключыўшы дамову на перадачу храма вернікам [25, арк. 10, арк. 17]. У 1956 г. аднавіла рэгістрацыю і Апідамская абшчына [31, арк. 35].

Нягледзячы на спыненне афіцыйнай дзейнасці многіх стараверскіх абшчын у папярэдні перыяд, архіўныя крыніцы сведчаць аб нелегальнай дзейнасці шэрагу з іх у другой палове 1950-х гг. Як вынікае з крыніц, на 1955 г. захоўваліся звесткі аб дзейнасці ў в. Валкі Казьянкаўскага с/с Відзаўскага раёна групы вернікаў-стараевераў (гэта былая Грыгараўшчынская абшчына) [32, арк. 4]. Таксама працягвала функцыянаваць ужо вышэй згаданая рэлігійная група стараевераў у в. Лучай. У 1957 г. абшчына нават абрала сабе духоўнага настаўніка С.Я. Русалоўскага. Аднак у 1961 г. гэтая "незаконная" дзейнасць абшчыны была выяўлена з боку ССРК, а таму храм быў зачынены. У 1963 г. Лучайская стараверская царква была разабрана і перададзена для рамонту школы ў в. Мікуліна (Глыбоцкі раён) [29, арк. 32–33, арк. 34, арк.35; 21, арк. 212–213]. У архіўных дакументах утрымліваюцца звесткі і аб дзейнасці Буеўшчынскай абшчыны ў гэты час. З сярэдзіны 1950-х гг. духоўным настаўнікам у ёй быў абраны Г.Т. Зайцаў, пасля чаго багаслужэнні сталі праводзіцца ў яго хаце ў в. Дзедушкі (недалёка ад Буеўшчыны). У такім стане абшчына працягвала сваю "нелегальную" дзейнасць да пачатку 1960-х гг. [21, арк. 211].

У выніку адміністрацыйна-тэрытарыяльных змен 1960 г. Маладзечанская вобласць была расфарміравана. Яе паўночныя раёны ўвайшлі ў склад Віцебскай вобласці, а астатнія – у склад Мінскай і Гродзенскай. З гэтага часу 13 яе стараверскіх абшчын (Апідамская, Куклянская, Ніўнікаўская, Кублішчынская, Ластавіцкая, Ракаўская, Германавіцкая, Варонкаўская, Булавішкаўская, Мінкавіцкая, Мікалаюнцаўская, Кірылінская і Відзаўская) апынулася ў Віцебскай вобласці, 2 (Свірская і Масцішская) – у Мінскай, а 1 (Стрыпішская) – у Гродзенскай.

**Заключэнне.** Такім чынам, на аснове аналізу матэрыялаў прыходзім да наступных высноў.

Як і ў папярэднія перыяды, у першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі паўночна-заходні рэгіён Беларусі з'яўляўся важным цэнтрам стараверства. У 1945–1950-я гг. у яго межах захоўвалася раней сфарміраваная сетка абшчын. Адразу пасля Вялікай Айчыннай Вайны у рэгіёне функцыянавала каля 30 стараверскіх рэлігійных аб'яднанняў, у пасляваенны перыяд значная іх частка прайшла рэгістрацыю і працягнула сваю дзейнасць. Аднак гэты працэс афіцыйнага афармлення быў больш складаным і працяглым, чым ва Усходняй Беларусі (асноўная іх маса была зарэгістравана толькі ў 1947–1949 гг.). На працягу канца 1940-х – пачатку 1950-х гг. шэраг стараверскіх прыходаў быў зняты з афіцыйнага ўліку, але колькасць стараверскіх абшчын у паўночна-заходнім рэгіёне, якія спынілі афіцыйную дзейнасць у гэты час, была непараўнальна меншай, чым па астатняй краіне. Таму па колькасці зарэгістраваных рэлігійных аб'яднанняў паўночна-заходнія беларускія землі вылучаліся сярод астатніх рэгіёнаў кампактнага пражывання старавераў у краіне. У канцы 1950-х гг. у рэгіёне налічвалася 16 зарэгістраваных рэлігійных аб'яднанняў старавераў-беспапоўцаў. Фактычна, з гэтага часу рэгіён з'яўляецца важнейшым цэнтрам стараверства ў Беларусі, аднак пры гэтым каля паловы з дзеючых пасля вайны стараверскіх абшчын так і не былі зарэгістраваныя. Шэраг з іх працягнуў нелегальную працу, а больш дробныя распаліся ці далучыліся да суседніх дзеючых прыходаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Аўсейчык У.Я. Стараверы Беларусі ў 1830–1860-я гг.: тэрыторыя рассялення і колькасны склад // Беларускі гістарычны часопіс. – 2022. – № 11. – С. 10–17.
2. Аўсейчык У.Я. Стараверы заходніх беларускіх земляў у 1920 – 1930-я гг.: спецыфіка рассялення і дынаміка колькасці // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманит. науки. – 2022. – № 1. – С. 40–49.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 952. Воп. 2. Спр. 2
4. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 2. Спр. 6.
5. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 2. Спр. 20.
6. Аўсейчык У.Я. Стараверскія абшчыны Віцебскай вобласці ў 1945 – першай палове 1950-х гг. // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманит. науки.. – 2023. – № 1(66). – С. 76–82.
7. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 2. Спр. 10.
8. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 2. Спр. 5.
9. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 2. Спр. 11.
10. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 2. Спр. 13.
11. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 2. Спр. 19.
12. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 2. Спр. 27.
13. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 145.
14. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 141.
15. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 136.
16. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 143.
17. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 1. Спр. 25.
18. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 146.
19. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 2. Спр. 28.
20. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 1. Спр. 19.
21. ДАВВ. – Ф. 4029. Воп. 1. Спр. 13.
22. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 139.
23. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 142.
24. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 140.
25. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 147.
26. Православная церковь на Витебщине (1918–1991): док. и материалы / редкол.: Пищуленок (гл. ред.) и др.; сост. В.П. Коханко (отв. сост.). – Минск: НАРБ, 2006. – 365 с.
27. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 1. Спр. 37.
28. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 1. Спр. 31.
29. ДАВВ. – Ф. 4029. Воп. 1. Спр. 15.
30. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 1. Спр. 2.
31. ДАВВ. – Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 150.
32. НАРБ. – Ф. 952. Воп. 2. Спр. 51.

*Паступіў 04.04.2023*

# СТАРООБРЯДЧЕСКИЕ ОБЩИНЫ СЕВЕРО-ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ В СЕРЕДИНЕ 1940-х – 1950-е гг.

***В.Е. ОВСЕЙЧИК***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

*Статья посвящена характеристике старообрядческих общин в северо-западной Беларуси в середине 1940-х – 1950-х гг. Анализируется состояние старообрядчества в регионе в этот период, прослеживаются процессы официального оформления (регистрации) старообрядческих религиозных объединений, характеризуются их взаимоотношение с органами советской власти. На основе архивных материалов в работе освящается государственная политика в отношениях старообрядческой церкви в северо-западном регионе Беларуси в отмеченный промежуток времени.*

***Ключевые слова:*** *старообрядцы, этническая группа, религиозная община, конфессия, северо-западная Беларусь, государственно-конфессиональные отношения.*

# OLD BELIEVER COMMUNITIES IN NORTH-WESTERN BELARUS IN THE MID-1940s TO THE 1950s

***U. AUSEICHYK***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*The article is devoted to the characteristics of Old Believers' communities in North-Western Belarus in the mid 1940s – 1950s. The author analyzes the state of Old Beliefs in the region during this period, traces the processes of official registration of Old Believers' religious associations, characterizes their relations with the Soviet authorities. On the basis of archival materials, the article examines the state policy towards the Old Believers in the North-Western region of Belarus during the mentioned period of time.*

***Keywords:*** *Old Believers, ethnic group, religious community, confession, North-Western Belarus, state-confessional relations.*